ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У.І.ЛЕНІНА»
АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйны веснік

ЛІПЕНЬ

Віцебск
2012

ДУ “ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА”
Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Ліпень

Інфармацыйны веснік

ВІЦЕБСК, 2012

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К 90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *В. М. Нявейкава*
Камп'ютарная вёрстка *А. В. Юпатава*
Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : ліпень : інфармацыйны веснік / ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна", Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. – Віцебск, 2012. – 33 с.

Штомесячны інфармацыйны веснік разлічаны на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначаны для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных і музейных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў

© ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна", 2012 г.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Ліпень

Інфармацыйны веснік

2012 г.

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *В. М. Нявейкава*
Камп'ютарная вёрстка *А. В. Юпатава*
Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

Надрукавана на ксераксе
ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна"
210601, Віцебск, Леніна, 8-а
E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

ЗМЕСТ

ПРАДМОВА……4

ХРОНІКА ПАДЗЕЙ

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці: інфармацыйнае паведамленне……5

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

XXI Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску"……28

ПРАДМОВА

“Культурнае жыццё Віцебскай вобласці” – штомесячны інфармацыйны веснік, разлічаны на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка “Хроніка падзей” уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 па 31 ліпеня 2012 года. “Хроніка падзей” таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя аддзеламі культуры Міёрскага і Талачынскага райвыканкамаў, Браслаўскай, Верхнядзвінскай, Віцебскай, Гарадоцкай, Докшыцкай, Лепельскай, Полацкай, Пастаўскай, Сенненскай, Ушацкай, Чашніцкай, Шаркаўшчынскай раённых сетак бібліятэк, а таксама Віцебскай, Наваполацкай і Полацкай гарадскіх сетак бібліятэк.

“За лучшее воплощение национальной темы и высокое исполнительское мастерство”, якая заснавана Віцебскім аблвыканкамам, атрымала выканаўца з Кубы *Луселія Ролдан*.

Дзевяць спектакляў расійскіх, беларускага і латвійскага тэатраў уключала праграма “Тэатральных сустрэч” XXI Міжнароднага фестывалю “Славянскі базар у Віцебску”. Асноўнай пляцоўкай сустрэчы тэатралаў з любімымі артыстамі, сярод якіх Г. Польскіх, В. Смірніцкі, Т. Краўчанка, А. Панін, Р. Янкоўскі, В. Талызіна, Ю. Мяньшова і іншыя вядомыя імёны, традыцыйна стала сцэна Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа. Прадзюсарская кампанія “Аметист” (Расія) прадставіла пастаноўку “Госпожа министерша”, спектаклі “Валентинов день” Сучаснага тэатра антрэпрызы (Расія), іранічны дэтэктыў “Западня” Міжнароднай тэатральнай кампаніі “АРТ” (Расія), трагіфарс “Баба Шанель” Маскоўскага тэатра на Паўднёвым Захадзе. **14** і **15 ліпеня** акрамя паказаў у тэатры Я. Коласа спектаклі праграмы дэманстраваліся на сцэне канцэртнай залы “Віцебск”. Прыхільнікам Мельпамены прыйшлося зрабіць нялёгкі выбар паміж “Пане Коханку” Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага (Беларусь) і спектаклем Міхаіла Задорнава “Хочу купить вашего мужа”, а таксама меладрамай з элементамі камедыі “Жаночае шчасце” Даўгаўпілскага драматычнага тэатра (Латвія) і камедыяй “Авантурная сямейка, ці як выкрасці мільён” Тэатральнага дома “Миллениум”. Завершыла праграму “Тэатральных сустрэч-2012” выступленне творчага калектыву Маскоўскага драматычнага тэатра імя К. С. Станіслаўскага (Расія) з пастаноўкай “Мальер”.

Новыя работы кінематаграфістаў Беларусі, Літвы, Латвіі і Эстоніі склалі насычаную кінапраграму фестывалю, якая адкрылася **14 ліпеня** паказам кінастужкі “Одинокий остров” (Беларусь, Латвія, Эстонія) рэжысёра Пеэтэра Сіма.

Падрыхтавана па матэрыялах друку
http://ng.by/ru/issues?art_id=67377

Удзел у ім прымалі 23 майстры, а пераможцай стала кіраўнік кружка РДК аграгарадка Ноўка *Жанна Фёдарава.* 15 ліпеня адбылася прэзентацыя расійска-беларускага праекта “Букет для славянки”, у рамках якога адкрылася выстаўка вырабаў з калекцыі “Цветы Росии” вядомага прадпрыемства “Павловопосадская платочная мануфактура” і аўтарскай калекцыі адзення “Вяртанне да вытокаў” *Ніны Бабровіч* – майстра цэнтра “Дзвіна”. Усяго ў кірмашы прынялі ўдзел каля 500 майстроў.

14-15 ліпеня ў Віцебску адбылося свята, прысвечанае Міжнароднаму дню шакалада. Яго ініцыятарамі выступілі ТАА “Група кампаній «Лідскія бліны»” і Віцебскі гарвыканкам.

Урачыстаё закрыццё фестывалю адбылося **18 ліпеня**. У канцэрце зорак прымалі ўдзел Алсу, Надзея Бабкіна і ансамбль “Руская песня”, Аляксандр Маршал, Вікторыя Алешка, Іна Афанасьева, Ірына Дарафеева, Аляксандр Ціхановіч і Ядвіга Паплаўская, групы “Чысты голас”, “Litesound”, Мікалай Гнацюк, дуэт Патап і Насця.

Дзесяцігадовы юбілей адзначыў у гэтым годзе Міжнародны дзіцячы музычны конкурс “Віцебск-2012”. Гран-пры фестывалю заваявала юная выканаўца з Грузіі *Мірыям Бічашвілі*. Лаўрэатам I прэміі стаў *Алішэр Жаксыбай* (Казахстан), II прэмію падзялілі *Паліана Рыжак* (Украіна), *Дзіяна* (Румынія), *Шухрат* (Узбекістан), III – дасталася *Паўліне Скрабітэ* (Літва).

Два дні працягваўся Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні “Віцебск-2012”. Кожны з 20 спевакоў дастойна прадставіў сваю краіну. Першая прэмія – 9 тысяч долараў, спецыяльны прыз “Ліра” і дыплом лаўрэата конкурсу прысуджаны канкурсантцы з Латвіі *Саманце Ціна*, другую прэмію атрымала канкурсантка з Украіны *Галіна Конах.* Трэцюю прэмію падзялілі *Федэрыка Марынары* (Італія) і прадстаўніца Балгарыі *Славіна Калканджыева.* А дыплом уладальніка Гран-пры быў уручаны *Бобану Майсоўскі (Македонія).* Спецыяльную прэмію У. Мулявіна

ХРОНІКА ПАДЗЕЙ

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

Ганаровай граматай Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ўзнагароджана *Святлана Аляксандраўна Гур’янава*, загадчык філіяла “Музей прыватных калекцый”, за актыўную работу ў галіне культуры, асабісты ўклад у справу музеязнаўства і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Народнае слова. – 2012. – 17 ліп. – С. 3.

1 ліпеня на Кургане Дружбы прайшла 53-я сустрэча ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і партызанскага руху Беларусі, Расіі, Латвіі, жыхароў прыгранічных тэрыторый трох краін.

570-ты год нараджэння Сянно адзначалі ў ліпені жыхары і госці горада. Парк 40-годдзя Перамогі стаў галоўнай пляцоўкай урачыстасцяў. Святочная праграма Дня горада працягнула тэатралізаванае прадстаўленне “Табе, любімы горад”, выступленні вакальных і харэаграфічных калектываў Сенненскай дзіцячай школы мастацтваў, раённага цэнтра дзяцей і моладзі. Больш за 30 калектываў мастацкай самадзейнасці прынялі ўдзел у святочных канцэртах. Свае творчыя падарункі прынеслі народныя ансамблі “Вечарынка” і “Вясёлыя музыкі”, гурты Ходцаўскай і Белаліпскай устаноў культуры. Маляўнічыя краявіды прывабілі да сябе віцебскіх мастакоў. Член Беларускага саюза мастакоў *Мікалай Драненка*, дарэчы ўраджэнец раёна, і яго калегі *Вадзім Осіпаў*, *Валерый Галубцоў* і *Іван Дзямко* стварылі жывапіснае палатно. Карціну мастакі падарылі раённаму гісторыка-краязнаўчаму музею. Падарункам усім сенненцам стаў гімн Сянно, створаны *Міхаілам Насоўскім*, дырэктарам раённага

Дома культуры, спецыяльна да свята.

Голас Сенненшчыны. – 2012. – 7 ліп. – С. 5.

1 ліпеня ў Міёрах адбылося раённае свята, прысвечанае 40-годдзю надання райцэнтру статуса горада. У рамках святкавання была адкрыта мемарыяльная дошка славутаму земляку, герою-падводніку, віцэ-адміралу *Ягору Андрэевічу Томку*, на выстаўку дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва запрасілі жыхароў і гасцей горада народныя майстры з Дзісны, Глыбокага, Браслава і Пастаў. Канцэртныя праграмы падрыхтавалі запрошаныя творчыя калектывы: народны фальклорны калектыў "Талака" (г. Віцебск), духавы аркестр Полацкага пагранатрада. Для маладзёжнай аўдыторыі цікавымі мерапрыемствамі сталі рэп-тусоўка "Вулічныя танцы", рок-канцэрт "СтарМ запрашае сяброў". На працягу ўсяго свята дзейнічалі дзіцячыя атракцыёны, працаваў святочны гандаль, правадзіліся гульнёвыя конкурсныя праграмы, спартыўныя спаборніцтвы.

Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама
Міёрскія навіны. – 2012. – 5 ліп. – С. 1-2.

3 ліпеня наша краіна адзначыла Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. У Віцебску святкаванне Дня Незалежнасці пачалося з урачыстага ўскладання кветак да Манумента воінам-вызваліцелям і мітынгу з удзелам кіраўніцтва Віцебскага аблвыканкама і гарвыканкама, грамадскасці. Затым адбылося вялікае харэаграфічнае прадстаўленне "Квітней, Беларусь!". Тэатралізванае шэсце змянілася канцэртам, забаўляльныя праграмы былі праведзены ў парку Савецкай Арміі, Парку культуры і адпачынку чыгуначнікаў, культурна-гістарычным комплексе «Залатое кола горада Віцебска "Дзвіна"». У пешаходнай зоне на вуліцах Суворава і Талстога разгарнулася выстаўка-кірмаш работ віцебскіх мастакоў і народных майстроў. Заключным акордам урачыстасцей стаў канцэрт, які завяршыўся акцыяй "Спяём гімн разам".

3 ліпеня ў Дуброўне прайшла патрыятычная маладзёжная акцыя "За Беларусь". Актывісты БРСМ выйшлі на вуліцы горада, каб раздаць удзельнікам святочнага мітынгу чырвона-зялёныя стужкі, як сімвал адданасці традыцыям

"Еўрабачанне" (Ларын, "Буранаўскія бабулі", Аляксандр Рыбак), а таксама пераможцы Міжнародных дзіцячых музычных конкурсаў "Віцебск 2003–2012".

Маладзёжная дыскатэка "DJ Night" з удзелам вядомага дзіджэя Alex Gaudino (Італія), 2-гі Міжнародны фестываль "Огонь танца-2012", які сабраў 400 танцораў і больш за 500 прадстаўнікоў маладзёжных субкультур, спартыўна-забаўляльная праграма, маладзёжны фэст "Копилка талантов", 65-гадовы спартсмен-гіравік *Анатолій Яжоў*, ураджэнец Віцебска, на сцэне ўстанавіў новы рэкорд Гінеса – і гэта далёка не ўсе падзеі святкавання Дня моладзі на фестывалі.

У рамках "Славянскага базару" ў абласным цэнтры прайшоў Міжнародны фестываль творчасці інвалідаў "Віцебск-2012". Звыш 100 прадстаўнікоў розных краін прынялі ўдзел у выстаўцы дэкаратыўна-прыкладной творчасці і конкурснай праграме. Дыпламанты парадавалі сваіх прыхільнікаў гала-канцэртам на адкрытай пляцоўцы "Пасад майстроў" у культурна-гістарычным комплексе «Залатое кола горада Віцебска "Дзвіна"». Раённыя Дамы рамёстваў прадставілі сваю прадукцыю ў "Горадзе майстроў", які ў гэты раз "прапісаўся" ў парку Пераможцаў, удзел у ім прынялі 200 майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Кірмаш-продаж вырабаў народных майстроў у гэтым годзе прайшоў на двух берагах Заходняй Дзвіны. Палюбавацца на работу ганчароў, рэзчыкаў па дрэве, кавалёў і шкловыдзімальшчыкаў запрашаў "Задзвінскі кірмаш", які размясціўся каля культурна-гістарычнага комплекса «Залатое кола горада Віцебска "Дзвіна"». 13 ліпеня адкрыўся пленэр разьбяроў па дрэве, у якім прынялі ўдзел майстры з Польшчы, Расіі, Беларусі. 13 і 14 ліпеня кавалі з усёй Беларусі дэманстравалі на падвор'і майстар-клас. Працавала выстаўка "Лоскутная мозаика" – сумесны праект майстроў з Обнінска Калужскай вобласці і клуба "Фенікс" з Полацка. 14-15 ліпеня прайшоў другі абласны конкурс выцінанак "Ажурныя Мары".

XXI Міжнародны фестываль мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”

XXI Міжнародны фестываль мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску” праходзіў у гэтым годзе з **12** па **18 ліпеня**. Фестываль заваяваў добрую рэпутацыю ў свеце мастацтва і культуры, ён двойчы прызнаваўся Міжнароднай федэрацыяй фестывальных арганізацый “Лучшим фестивалем года”. Больш за 75 мерапрыемстваў прайшло на 11 фестывальных пляцоўках, 20 канцэртаў адбыліся ў Летнім амфітэатры.

11 ліпеня ў канцэртнай зале “Віцебск” Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь (мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Віктар Бабарыкін) прадставіў сімфа-рок-праграму “Ураган”.

Ужо стала добрай традыцыяй пачынаць фестываль “Славянскі базар у Віцебску” адкрыццём новай зоркі на Алеі лаўрэатаў спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта Беларусі. У гэтым годзе “запалілася” зорка ў гонар народнага артыста Расіі Льва Лешчанкі.

500 манет наміналам “21 базар” былі выпушчаны да фестывалю. Кошт сувеніра склаў 80000 рублёў.

Інтэрнацыянальнай і па-сапраўднаму зорнай стала і канцэртная праграма адкрыцця міжнароднага форума. Перад гледачамі выступілі вядомыя артысты з Расіі (Леў Лешчанка, Ірына Алеграва, Валерыя, Дзяржаўны акадэмічны ансамбль народнага танца імя Ігара Маісеева), замежныя госці (Крыс Норман, Саманта Фокс і група “The Cavern Beatles”, Алесандра Сафіна), а таксама нашы суайчыннікі (Гюнеш, Алена Ланская, ансамбль “Сябры”, Беларускі дзяржаўны ансамбль “Песняры”, ВІА “Верасы”. Парадавалі на адкрыцці свята мастацтваў пераможцы і прызёры песеннага конкурсу

роднай краіны. Адным з мерапрыемстваў у гонар Дня Незалежнасці ў Докшыцах стала асвячэнне новага крыжа на мемарыяльным комплексе “Ходараўка”, якому сёлета спаўняецца 20 гадоў. У Міёрах дзяржаўнае свята сабрала на плошчы Загінуўшых барацьбітоў дэлегатаў усіх працоўных калектываў райцэнтра. Тут адбыўся мітынг і ўрачыстае адкрыццё раённай Дошкі гонару. У Чашніках стартаваў патрыятычны велапрабег “Дарогамі Прыдзвінскага краю”. На свята ў Гарадоччыну завітала Расійская дэлегацыя прадстаўнікоў Невельскага раёна, з якім раён падтрымлівае сяброўскія сувязі. На Верхнядзвіншчыне адкрылі мемарыял памяці воінам-афганцам. У Наваполацку ўрачыста адкрылі алею і памятны знак-валун з мемарыяльнай дошкай Ганароваму грамадзяніну Наваполацка *Льву Вітальевічу Наважылаву,* які доўгі час узначальваў ВА “Палімір”.

Народнае слова. – 2012. – 5 ліп. – С. 1, 9.
Міёрскія навіны. – 2012. – 5 ліп. – С. 1-2.
Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 7 июля. – С. 2.
Новая газета (Новополоцк). – 2012. – 6 июля. – С. 2.
Дняпроўская праўда (Дуброўна). – 2012. – 14 ліп. – С. 4.

Некалькі дзён жыхары і госці г. Оршы прымалі ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных 945-годдзю Оршы і Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Разам з аршанцамі двайное свята адзначылі і дэлегацыі гарадоў-пабрацімаў г. Бельц (Малдова), г. Чаркасы (Украіна), г. Цяльшай (Літва), г. Вязьма, раёна Заходняе Дзядуніна г. Масквы, г. Гагарын (Расія) і інш.

У Аршанскай гарадской мастацкай галерэі В. Грамыкі падчас святкавання 945-годдзя з дня ўтварэння Оршы і Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь адкрыліся дзве ўнікальныя міжнародныя выстаўкі. Тут былі прадстаўлены работы *Аляксандра Барысавіча Угланава*, майстра пэндзаля з Цвяры, і палатна Аршанскага народнага клуба самадзейных мастакоў “Ренессанс”. Таксама наведвальнікі змаглі азнаёміцца з творчасцю мастака з горада на Няве *Віктара Уладзіміравіча Бердакова* і яго тэатрам вобразаў “Грим-асы”.

Аршанская газета. – 2012. – 7 ліп. – С. 6.

Дзень Незалежнасці Беларусі, як іншыя агульнанацыянальныя святы, – заўсёды яркая, незабывальная падзея для жыхароў нашай рэспублікі. А для талачан яно радаснае ўдвая, бо 3 ліпеня адзначаецца Дзень горада. Творчымі работнікамі Талачынскага ГДК праведзена культурна-дасугавая праграма "За квітнеючую Беларусь", з канцэртнай праграмай выступіў вакальна-інструментальны ансамбль "Сузор'е" Талачынскага ГДК, асобныя выканаўцы з Коханаўскага ГПДК, Трасцянскага КБ, Райцаўскага СДК, Варанцэвіцкага СДК, Дзімітраўскага СДК, вучні эстраднага аддзялення Талачынскай ДШМ, працавала выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва "Беларусь у маім сэрцы" раённага Дома рамёстваў. Адбыліся і іншыя святочныя мепрыемствы: канцэрт "Беларусь – мая песня" (Славенскі СК), вечар-партрэт "Как это было" (Навасельскі СК), праведзены мітынг-рэквіем "Память живая" на пляцоўцы ля помніка ў в. Валосава.

Аддзел культуры Талачынскага райвыканкама

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

У рамках святкавання 200-годдзя перамогі рускай арміі над войскамі Напалеона ў Айчыннай вайне 1812 года ў г. Себежы Пскоўскай вобласці прайшлі міжнародныя гісторыка-краязнаўчыя чытанні "Страницы истории Отечественной войны 1812 года приграничных территорий России, Латвии, Беларуси". Удзел у мерапрыемстве прынялі юныя экскурсаводы Клясціцкага школьнага музея і іх педагогі, а таксама супрацоўнікі Расонскага музея баявой садружнасці і краязнавец *Дзмітрый Кузякоў*. Завяршыліся чытанні на расонскай зямлі ў аграгарадку Клясціцы.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 17 ліп. – С. 7.

У **ліпені** былі падпісаны дагаворы аб супрацоўніцтве

Карына Жураўлёва (дыплом V ступені). У намінацыі "Ансамбль" узнагароджаны фартэпіянныя дуэты школы: *Дзіяна Рудакова і Кірыл Атрошчанк*а (дыплом I ступені), *Святлана Партнова і Вікторыя Ляхава* (дыплом лаўрэатаў III ступені).

Аршанская газета. – 2012. – 28 ліп. – С. 4.

25–29 чэрвеня ў Магілёве прайшоў XVII Міжнародны хрысціянскі фестываль духоўнай музыкі "Магутны Божа". Дыплом I ступені быў уручаны Віцебскаму гарадскому народнаму маладзёжнаму хору.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 17 ліп. – С. 8.

Сваё 55-годдзе ў чэрвені адзначыў народны хор народнай песні абласнога таварыства інвалідаў па зроку "Славіца". Юбілейны канцэрт адбыўся ў культурна-гістарычным комплексе «Залатое кола горада Віцебска "Дзвіна"».

Народнае слова. – 2012. – 5 ліп. – С. 16.

У полацкім кінатэатры “Радзіма” адбылася прэзентацыя кароткаметражнага фільма “rENovation” – дэбютнай працы наваполацкіх аматараў-кінематаграфістаў “SameFrame”.

Полацкі веснік. – 2012. – 10 ліп. – С. 8.

МАТЭРЫЯЛЫ, ЯКІЯ НЕ ЎВАЙШЛІ Ў ПАПЯРЭДНІ ВЫПУСК

У краязнаўчым музеі Віцебска ў чэрвені прайшла выстаўка работ дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўдзельнікаў абласнога свята-конкурсу для людзей з абмежаванымі магчымасцямі “Солнечный мир для всех”. Конкурс адбыўся 30 мая 2012 года ў рамках арт-праекта “Здравневская палитра” (да 120-годдзя сядзібы “Здраўнёва”).

Витебский проспект. – 2012. – 7 июня. – С. 4.

У маі ў Лідзе адбыўся заключны тур Рэспубліканскага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І. І. Жыновіча. Віцебскую воблаць прадстаўлялі выхаванцы Полацкай дзіцячай школы мастацтваў. Віртуознае валоданне сваім інструментам прадэманстраваў *Яўген Сарокін* (баян), *Даніла Асяпёнак* (баян), абодва занялі ІІ месца ў сваіх узроставых групах. Прызавое ІІІ месца заваявала *Анастасія Пуціліна* (гітара). Такога ж выніка дабілася *Ганна Матвейка* (цымбалы), якая атрымала грамату за лепшае выкананне абавязковага твора. Добра выступілі *Аліса Салаўёва* (балалайка), *Сяргей Казлоў* (баян) і *Дзмітрый Прыймак* (гітара).

Полацкі веснік. – 2012. – 27 ліп. – С. 15.

У чэрвені ў Ялце прайшоў Міжнародны музычны конкурс дзіцячага выканаўчага майстэрства “Восхождение”. Беларусь прадстаўлялі выхаванцы фартэпіяннага аддзялення дзіцячай школы мастацтваў № 3 г. Барані. У намінцыі “Сола” прызёрамі сталі *Кірыл Атрошчанка* (дыплом лаўрэата ІІ ступені) і *Анастасія Калініна* (дыплом VI ступені), выпускніца школы, навучэнка 1-га курса музычнага каледжа

паміж Гарадоцкім раёнам і Белацаркоўскім (Кіеўская вобласць, Украіна), а таксама г. Бабаева (Валагодская вобласць, Расійская Федэрацыя). Пагадненне аб партнёрстве прадугледжвае стварэнне ўмоў для развіцця гандлёва-эканамічных, навукова-тэхнічных і культурных адносін паміж рэгіёнамі.

Гарадоцкі веснік. – 2012. –14 ліп. – С. 1.
Гарадоцкі веснік. – 2012. – 21 ліп. – С. 1.

Міжнародны фестываль тэатра лялек і анімацыйных фільмаў для дарослых “Кукла тоже человек” **2** і **3 ліпеня** прадставіў сваю праграму жыхарам г. Віцебска. Была паказана пастаноўка рэжысёра *Дароты Донбэк* “Другая комната”, спектакль *Войцеха Алейніка* “Топорлянд”. Пасля спектакляў гледачы змаглі азнаёміцца з анімацыйнымі фільмамі для дарослых, якія створаны ў самых вядомых польскіх студыях – “Се-ма-фор” і “Серафіньскі”.

Витебский проспект. – 2012. – 12 июля. – С. 22.

Народае свята “Купалле” **7 чэрвеня** сабрала віцяблян і гасцей горада ў комплексе культурна-масавага адпачынку імя Савецкай Арміі. Яркія фарбы самабытнага беларускага свята запаліліся вясёлкай талентаў на новай сцэне. Яе рэнавацыя – адно з мерапрыемстваў сумеснага праекта LLB-1-072 “Даўгаўпілс і Віцебск: культурнае супрацоўніцтва і развіццё” Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва “ЛАТВІЯ – ЛІТВА – БЕЛАРУСЬ”, якая рэалізуецца ў рамках Еўрапейскага інструмента добрасуседства і партнёрства. Праект стартаваў у снежні мінулага года і мае мэтай распаўсюджванне ведаў пра нацыянальную культуру і фальклор Беларусі і Латвіі. Свята дало праекту творчую рэалізацыю. Удзел у ім прынялі калектывы Цэнтра латышскай культуры Даўгаўпілса – фальклорная група песні і танца “Сватра”, дзіцячая вакальная студыя “Перлітес”, група прафесійнага аркестра духавых інструментаў “Даўгава”, а таксама вакальныя і харэаграфічныя калектывы Цэнтра культуры “Віцебск”.

Витебский проспект. – 2012. – 12 июля. – С. 5.

Міжнародная летняя школа мастацтва пры Музеі Марка Шагала адзначала свой пяцігадовы юбілей у Германіі. **14 ліпеня** ў Нінбург адправіліся выкладчыкі віцебскіх Цэнтра эстэтычнага выхавання "Маладзік", дзіцячай мастацкай школы № 1, дзіцячай мастацкай школы Полацка, супрацоўнікі Музея Марка Шагала і бюро міжнароднага маладзёжнага турызму "Спутник" (адзін з заснавальнікаў летняй школы на працягу ўсіх гадоў), а таксама група навучэнцаў з Віцебска, Полацка, Мінска і Гомеля.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 5 июля. – С. V.

З **26** па **29 ліпеня** ў Верхнядзвінскім раёне працаваў **XXI Міжнародны маладзёжны лагер "Бе-La-Русь"**. Тэмай сёлетняга лагера стала кінамастацтва, і прайшоў ён пад дэвізам "Kurgan kinofest-2012". Маладыя людзі з Беларусі, Латвіі і Расіі змаглі паспрабаваць сябе ў якасці аператараў і рэжысёраў пры стварэнні фільма пра лагер, наведалі розныя майстар-класы, прынялі ўдзел у творчых конкурсах і спартыўных спаборніцтвах.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 24 ліп. – С. 1.

31 ліпеня пачаўся дзевяты **праваслаўны маладзёжны фестываль "Адзігітрыя"**. Ён прадоўжыцца на Віцебшчыне да 6 жніўня. У праграме канцэрт удзельнікаў фестывалю каля Свята-Успенскага кафедральнага сабора, сустрэча з *епіскапам Бронніцкім Ігнаціем*, гала-канцэрт на сцэне Летняга амфітэатра і інш.

Народнае слова. – 2012. – 31 ліп. – С. 1.

КЛУБНАЯ СПРАВА

На пачатку ліпеня ансамбль народнай песні "Крынічанька" Глыбоцкага гарадскога Дома культуры прыняў удзел у рэспубліканскім песенным фестывалі "Пеўчае поле", які праходзіць раз у два гады ў Мядзелі, што на Міншчыне.

Веснік Глыбоччыны. – 2012. – 25 ліп. – С. 4.

Да фестывалю ў Віцебску быў адкрыты новы фантан. Ён аздобіў сабой набярэжную ракі Віцьбы, якая праходзіць паралельна вуліцы Талстога.

Витебский проспект. – 2012. – 26 июля. – С. 2.

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

Ураджэнец Лепеля *Мікалай Казакоў* заняў першае месца ў намінацыі "Лозапляценне" на рэспубліканскім конкурсе дэкаратыўна-прыкладной творчасці "Беларускі вянок".

Лепельскі край. – 2012. – 17 ліп. – С. 6.

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

Расшырыла свае плошчы прыватная мастацкая галерэя "Стена" ў г. Віцебску. З'явілася магчымасць адкрыць дзве залы: рэалістычную і сучасную. Дэбютнай выстаўкай новай залы стала экспазіцыя работ мінскага мастака-сімваліста *Сяргея Плотнікава*.

Народнае слова. – 2012. – 14 ліп. – С. 4.

У Аршанскай мастацкай галерэі пачала работу выстаўка хустак мануфактуры "Цветы России" г. Паўлаўскі Пасад (Расія).

Аршанская газета. – 2012. – 19 ліп. – С. 16.

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

8 чэрвеня ў Віцебску адбылася прэм'ера спектакля "Полеты с ангелом" па п'есе Зіновія Сагалава. Пастаноўку здзейсніў кіраўнік Нацыянальнага тэатра імя Якуба Коласа *Валерый Анісенка* ў 1999 годзе, яна з поспехам ішла на сцэне Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі. У спектаклі занятыя два акцёры, сцэнічны вобраз Марка Шагала ўвасобіў сам рэжысёр, Ангела сыграла артыстка тэатра беларускай драматургіі *Ганна Палупанава*.

Народнае слова. – 2012. – 7 ліп. – С. 7.

КІНАМАСТАЦТВА

сябра Беларускага саюза майстроў народнай творчасці *Ігара Яўсціхава*. Яго творы аб'ядноўвае тэма дахрысціянскай культуры продкаў: вобразы славянскіх багоў, рунічныя знакі. Наведвальнікі могуць убачыць абярэгі, оручні (бранзалеты), вокладкі кніг і дакументаў, сумкі, паясы і іншыя рэчы з дахрысціянскай сімволікай.

Полацкі веснік. – 2012. – 6 ліп. – С. 8.

З **26 ліпеня** Аршанскі этнаграфічны музей запрашае на выстаўку работ самадзейнага майстра абрэзкавага шыцця *І. Мархоцкай* "Узоры жизни". Аршанскі мемарыяльны музей Героя Савецкага Саюза К. С. Заслонава прапануе персанальную выстаўку "Мир, в котором я живу" самадзейнага майстра вышыўкі *Я. Жэндзінскай.*

ПОМНІКІ

13 ліпеня каля будынку пракуратуры вобласці адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця памятнага знака ветэранам органаў пракуратуры, якія стаялі на варце закона і прысвяцілі сябе службе Айчыне ў мірны час.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 17 ліп. – С. 7.

Напярэдадні Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь у Оршы адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі ў гонар воінаў-танкістаў 63-га асобнага гвардзейскага танкавага палка, які прымаў непасрэдны ўдзел у вызваленні Оршы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Аршанская газета. – 2012. – 5 ліп. – С. 3.

МАСТАЦТВА

АРХІТЭКТУРА

На працягу ліпеня клубнымі ўстановамі Міёрскага раёна праводзіліся святы вёсак для жыхароў сваіх зон абслугоўвання. Такія святы праведзены ў вёсках Паташня (Паташнянскі СК), Труды (Узмёнскі СДК), Павяцце (Павяцкі СДК), Юндэлова (Наўгародскі СДК), Акунёва (Сіцькоўскі СК). На свяце заўсёды гучаць добрыя і шчырыя словы ў адрас жыхароў вёсак, пачэснае месца займаюць выставы народных умельцаў, кулінарных вырабаў, а самым лепшым падарункам для жыхароў з'яўляецца віншавальная песня.

Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама

Творчы вечар полацкага паэта, кампазітара, музыканта *Васілія Граноўскага* прайшоў у Полацкім РДК.

Полацкі веснік. – 2012. – 6 ліп. – С. 8.

У ліпені клубнымі ўстановамі Талачынскага раёна былі праведзены святы вёсак Зарэчча (Воўкавіцкі СК), Алёнавічы, Межыёва (Гаршчэўшчынскі СК), Рафалова (Валосаўскі СК), Свіране (Жукнеўскі СК), Чарнаручча (Навасельскі СК), Парэчча, Скавышкі (Азерацкі СДК), Рамашкава (Рамашкаўскі КБ), Рыжычы (Дзімітраўскі СДК), Маляўка (Трасцянскі КБ).

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРЫ

Больш за 20 тысяч гасцей сабраліся ў в. Александрыя на рэспубліканскае свята Купалля **"Александрыя збірае сяброў**", якое ў трэцці раз прайшло **6-7 ліпеня** на мяжы Магілёўскай і Віцебскай абласцей. Былі на свяце дэлегацыі Расіі і Чарнігаўскай вобласці Украіны.

Народны тэатр гульні "Балаболы" Коханаўскага ГПДК прыняў удзел ў рэспубліканскім свяце, падчас якога выступілі калектывы мастацкай самадзейнасці Аршаншчыны: хор ветэранаў аматарскага аб'яднання "Зямны час", калектывы "Аршаначка" Антонаўскага СДК, "Родныя напевы" Межаўскага СДК, вакальная група раённага ДК г. п. Арэхаўск, сольныя выканаўцы. Здзівілі талентамі майстры раённага Дома рамёстваў і Цэнтра народнай творчасці рамёстваў г. п. Копысь, якія запрасілі гасцей свята на Віцебскае падвор'е.

Аршанская газета. – 2012. – 10 ліп. – С. 2.

Здаўна Купалле мела асаблівы сэнс, яно з'яўляецца адным з самых любімых святаў беларусаў. Тэатралізаваныя прадстаўленні, гульнёва-забаўляльныя праграмы былі падрыхтаваны работнікамі культуры і прайшлі ў кожным раёне. Так, ва Ушачах свята правялі на прыбярэжнай тэрыторыі возера Вечалле і ў Старым Сяле. Народнае гулянне "Как на Ивана Купалу" адбылося ў зоне адпачынку "Лесные карьеры" ў г. п. Лёзна. Тэатралізаванае прадстаўленне "Купальскі вянок" падрыхтаваў тэатр мініяцюр "Бум" Чашніцкага ГДК. У ноч з **6** на **7 ліпеня** на гарадскім паўвостраве ўдзельнікамі народнага тэатра Міёрскага РДК было прадстаўлена тэатралізаванае відовішча "Алёша Паповіч і сіла нячыстая". На Полаччыне традыцыі гэтага свята беражліва захоўваюцца. Ва ўсіх сельскіх установах культуры з вечара да позняй ночы ладзіліся народныя гулянні. У Фарынаўскім цэнтры культуры і вольнага часу пройшло тэатралізаванае прадстаўленне "Агні Купалля", жыхароў аграгарадка Блізніца работнікі Сільніцкага СДК запрасілі на вечар адпачынку "На Купала сонца грала", а потым – на свята "Прыходзьце пагуляць ды Купалле сустракаць". Работнікамі клубных устаноў Талачынскага раёна былі праведзены наступныя мерапрыемствы: свята "Раскладзі агонь, Купалле!" (Звяняцкі СДК), тэатралізаванае прадстаўленне "У пошуках папараць-кветкі" (Гаршчэўшчынскі СДК), "Купалінка" (Варанцэвіцкі СДК), абрад "Купальская ночка кароткая" (Марцюхоўскі КБ), вечар адпачынку "Купальскія прыгоды" (Дзімітраўскі СДК) і інш.

У Міёрах на базе адпачынку "Паўвостраў" **21** і **22 ліпеня** праходзіў міжнародны маладзёжны фестываль музыкі і танца **"BrasLove Open Air"**. Выступіла на ім 35 дзіджэяў з Расіі, Эстоніі, Літвы і Беларусі.

28 ліпеня ў аграгарадку Дабрамыслі Лёзненскага раёна прайшло абласное свята-конкурс самадзейных паэтаў і кампазітараў **"Песні сунічных бароў-2012"**. Удзел у ім прынялі творчыя людзі з райцэнтраў Віцебскай і Смаленскай абласцей, самадзейныя артысты ўстаноў культуры

Народнае слова. – 2012. – 21 ліп. – С. 3.

12 ліпеня ў Віцебскім абласным музеі Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова адкрылася выстаўка, прысвечаная беларускаму дыпламату *Уладзіміру Віктаравічу Грыгор'еву*. Экспазіцыя адкрылася падчас XXI Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". І гэта не выпадкова, бо менавіта дзякуючы Уладзіміру Віктаравічу ў абласным цэнтры, а не ў Прыбалтыцы, прайшоў фестываль польскай песні, які паклаў пачатак такога маштабнага форуму.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 21 ліп. – С. 6.

Выстаўка графікі *Андрэя Духоўнікава* "Два окна с видом на небо" прадстаўлена ў абласным краязнаўчым музеі.

Витебский проспект. – 2012. – 26 июля. – С. 23.

Вышываныя ручнікі, самабытная драўляная і плеценая з саломы мэбля, керамічныя збаны, фотаздымкі з выхапленымі з мінулага і сучаснага сюжэтамі – усё гэта можна ўбачыць у музеі горада Дзісна, які нядаўна справіў наваселле і гасцінна запрашае наведвальнікаў.

Міёрскія навіны. – 2012. – 24 ліп. – С. 3.

Мерапрыемства з назвай "Война 1812 года. Двести лет спустя" прайшло ў Лепельскім раённым краязнаўчым музеі. Са сваёй праграмай у горад прыехалі 13 супрацоўнікаў "Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны". Свята адбывалася ў рэжыме non-stop на працягу трох гадзін, наведвальнікі атрымалі магчымасць акунуцца ў атмасферу XIX стагоддзя.

Лепельскі край. – 2012. – 5 ліп. – С. 3.

У Полацкім цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур у **ліпені** адкрылася першая персанальная выстаўка *Наталлі Яўгенаўны Чымірыкінай* "Маляваны рай" (беларуская маляванка) і выстаўка "Асоба. Талент. Рамяство" адзінага ў Беларусі народнага майстра па мастацкай апрацоўцы скуры,

ізраільскіх мастакоў.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 5 ліп. – С. 4.
Віцебскі рабочы. – 2012. – 10 ліп. – С. 5.
Витебский проспект. – 2012. – 12 июля. – С. 23.

Полацкі Нацыянальны гісторыка-культурны запаведнік увайшоў у дзясятку самых папулярных беларускіх музеяў, апынуўшыся на трэцяй пазіцыі рэспубліканскага рэйтынгу. У склад запаведніка сёння ўваходзяць 11 музеяў, кожны з якіх па-свойму непаўторны.

Народнае слова. – 2012. – 21 ліп. – С. 7.

У Мастацкім музеі Віцебска прадстаўлена Міжнародная экспазіцыя работ "Славянскія эцюды", выкананых у жанры фітакалажу. Выстаўка ўключае 57 калажных работ 29 майстроў з трох дзяржаў, акрамя таго, у яе ўвайшлі экспанаты, прысвечаныя 200-годдзю Айчыннай вайны 1812 года.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 14 ліп. – С. 8.

Алег Кастагрыз выставіў свае вобразы на "распродажу". "SALE of Images" – так называецца яго выстаўка, якая экспануецца ў Мастацкім музеі.

Витебский проспект. – 2012. – 19 июля. – С. 23.

У Мастацкім музеі Віцебска ў дні фестывалю адкрылася фотавыстаўка *Вольгі Сальнікавай* "Впечатления", з такой жа назвай выйшаў і фотальбом. На выстаўцы прадстаўлены серыі работ, у якія ўвайшлі пейзажы, фестывальныя замалёўкі, партрэты, рэпартажы і мастацкія фатаграфіі.

Народнае слова. – 2012. – 26 ліп. – С. 16.

З **12 ліпеня** ў Віцебску спыніў працу адзіны ў Беларусі музей прыватных калекцый. Яго будынак прызналі аварыйным і закрылі па тэхнічных прычынах.

Лёзненшчыны. У час фестывалю былі арганізаваны выставачныя экспазіцыі ДЛГУ "Лёзненскі лясгас", гандаль сувенірнай прадукцыяй, выстаўка работ майстроў раённага Дома рамёстваў, работа фіта-бара (ЦБС), гульнёвыя праграмы.

Раённы конкурс маладых выканаўцаў эстраднай песні "Белыя росы" адбыўся ў Лепелі. Першае месца ў конкурсе маладых выканаўцаў заняла *Анастасія Стродава.* Сёлета гасцям мерапрыемства была прапанавана выстаўка "Падарунак фестывалю", падрыхтаваная творцамі сельскіх Дамоў культуры. Вясковыя артысты прадставілі сапраўдныя шэдэўры дэкаратыўна-прыкладной творчасці і кулінарнага майстэрства. Пераможцай на творчай выставе-прэзентацыі стала работа Баброўскага СДК.

Лепельскі край. – 2012. – 17 ліп. – С. 3.

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна

11 ліпеня ў чытальнай зале бібліятэкі выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі" прадставіла знакавы выдавецкі праект – серыю альбомаў "Энцыклапедыя рарытэтаў", якая з'яўляецца арыгінальным праектам выдавецтва, а таксама фотаальбом "Полацк. 1150". Серыя ўнікальных выданняў адкрывае забытыя помнікі гісторыі і культуры, спрыяе адраджэнню нацыянальных традыцый, прызвана стаць праваднікам паміж эпохамі і пакаленнямі.

31 ліпеня ў рамках агульнабібліятэчных мерапрыемстваў, прысвечаных Году кнігі, увазе спецыялістаў Віцебскіх электрычных сетак, філіяла РУП "Віцебскэнерга", быў прапанаваны агляд мастацкай літаратуры розных жанраў (фантастыка, дэтэктывы, раманы пра каханне), а таксама перыядычныя выданні, якія знаходзяцца ў аддзеле абанемента.

Аршанская гарадская сетка публічных бібліятэк

Выстаўка кніг ураджэнца Аршанскага раёна *Вячаслава*

Адамавіча Заранкова прайшла ў **ліпені** ў цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А. С. Пушкіна. Вячаслаў Адамавіч узначальвае адну з будаўнічых кампаній Санкт-Пецярбурга, піша карціны і кнігі. На выстаўцы былі прадстаўлены зборнікі, якія ён падарыў бібліятэцы.

Аршанская газета. – 2012. – 21 ліп. – С. 6.

У рамках штогадовай культурна-адукацыйнай акцыі "Орша – город читающий" у гарадскім парку былі прадстаўлены разнастайныя кніжныя выстаўкі, прысвечаныя 945-годдзю Оршы ("Мой горад і светлы, і слынны, як лёс беларуса"), Дню Незалежнасці ("Каб любіць Беларусь маю мілую") і інш. Супрацоўнікі гарадской ЦБС расказвалі аб правілах работы ў бібліятэках, раздавалі рэкламныя буклеты. Прыцягвалі ўвагу дзіцячыя кніжныя выстаўкі, афармленыя бібліятэкарамі дзіцячай бібліятэкі імя У. Караткевіча: "Любимые книжки для малыша и малышки", "Для ўсіх і для кожнага – перыёдыка розная" і "Оршанские писатели – детям". Самыя маленькія аршанцы змаглі ўбачыць пастаноўкі лялечнага тэатра "Калабок" і "Курачка Раба".

Аршанская газета. – 2012. – 7 ліп. – С. 6.

Віцебская гарадская сетка публічных бібліятэк

У Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь на вуліцу Пушкіна г. Віцебска жыхароў запрасіла святочная "Літаратурная пляцоўка", на якой можна было пазнаёміцца з разгорнутай экспазіцыяй кніг, перыядычных, агучаных і электронных выданняў з фондаў ЦГБ імя М. Горкага і атрымаць рэкламныя візітоўкі ўсіх гарадскіх бібліятэк. Дарослых наведвальнікаў запрашалі прыняць удзел у "Літаратурных гаданнях", а дзецям бібліятэкі імя Я. Маўра і імя С. Маршака прапаноўвалі ўдзел у віктарынах. Многія, завітаўшы на свята, бралі актыўны ўдзел у акцыі "Bookrossing – адпраў кнігу ў падарожжа".

Віртуальную вандроўку па памятных мясцінах Я. Купалы "Тут жыве памяць пра песняра" правялі **5 ліпеня** супрацоўнікі бібліятэкі імя У. Караткевіча.

24 ліпеня бібліятэка імя М. Астроўскага запрасіла сваіх чытачоў на літаратурнае свята "Пакуль ёсць Купала –

аздараўленчым лагеры Стральцоўскай школы бібліятэкар Дворнаўскай сельскай бібліятэкі правяла літаратурны вечар "Волаты беларускага адраджэння".

10 ліпеня ў дзіцячай бібліятэцы прайшла інфармацыйная гадзіна "Без книги жить нельзя на свете".

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА

Святочныя мерапрыемствы да 125-годдзя з дня нараджэння Марка Шагала пачаліся **6 ліпеня**. У краязнаўчым музеі Віцебска адкрылася выстаўка маладых мастакоў з Санкт-Пецярбурга "ПереJEWание" (кераміка, мазаіка, жывапіс, эмаль, коўка.). Сярод аўтараў, якія прадставілі свае работы, у асноўным выпускнікі Санкт-Пецярбургскай дзяржаўна-прамысловай акадэміі імя А. Л. Шцігліца. Фонд краязнаўчага музея папоўніўся выставачнай работай Ірыны Разумоўскай "Канал Грибоедова". Вядомы маскоўскі музей "Дом Бурганова" прывёз у віцебскі Мастацкі музей унікальную выстаўку. Цэнтрам экспазіцыі стаў партрэт Шагала. Гэтую скульптурную кампазіцыю Аляксандр Бурганаў стварыў у 2008 годзе па просьбе П'ера Кардэна. Кампазіцыя стала часткай інсталяцыі "Отъезд Марка Шагала из Витебска". Усяго на выстаўцы прадстаўлена больш за 30 работ вядомага скульптара, яго ўнучкі Юліі Смалянковай і вучня Міхаіла Грачова. **7 ліпеня** ў Доме-музеі мастака адбыўся літаратурна-музычны вечар, прайшло гашэнне марак, прысвечанае знамянальнай даце. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь прадаставіў сваім калегам каштоўны экспанат для выстаўкі адной карціны – "Партрэт Марка Шагала". Пад завяршэнне трохдзённых урачыстасцей адбыліся прэм'еры. У Арт-цэнтры Марка Шагала быў арганізаваны першы паказ дакументальнага фільма "Марк Шагал. Нереальная реальность". Сваю музычна-драматычную пастаноўку "Сны над Витебском" на сцэне абласной філармоніі прадставіў ансамбль салістаў з г. Мінска "Класік-Авангард" пад кіраўніцтвам У. Байдава. Коласаўцы ў сваю чаргу прапанавалі жыхарам і гасцям горада прэм'еру спектакля "Полеты с ангелом" і выстаўку "По следам Шагала в Израиле", экапанатамі якой сталі 30 работ сучасных

Мэта акцыі – стварыць дадатковы стымул для чытання сярод вучняў 1– 9 класаў.

Народнае слова. – 2012. – 26 ліп. – С. 14.

Ушацкая раённая сетка публічных бібліятэк

3 ліпеня супрацоўнікі Ушацкай ЦРБ імя Е. Лось і дзіцячай бібліятэкі прынялі ўдзел у святкаванні Дня горада і правялі мерапрыемства пад назвай "Ушачи – город читающий". У праграме: конкурс асілкаў "Легки ли знания?", краязнаўчая віктарына "Мая Ушаччына", стэнд-апытанне "Что Вы предпоЧитаете?", гульнёвы конкурс "Стихи, сказки, песни собрали нас вместе!".

Вялікадолецкая сельская бібліятэка **7 ліпеня** запрасіла сваіх чытачоў на літаратурную гадзіну "Пуцявінамі Янкі Купалы", а бібліятэкары Ушацкай ЦБС імя Е. Лось **11 ліпеня** правялі гадзіну мастацтва "Ускользающий лик Марка Шагала".

Чашніцкая раённая сетка публічных бібліятэк

У **ліпені** ў Чырвонараніцкай сельскай бібліятэцы для чытачоў сярэдняга школьнага ўзросту былі праведзены літаратурныя гонкі "Наша спадчына". Веды правяраліся з дапамогай віктарыны, загадак і прыказак.

Гістарычная экспедыцыя "Маршрутами Отечественной войны 1812 года: 200 лет спустя" адбылася ў Новалукомльскай дзіцячай бібліятэцы. Былі паказаны кадры з мастацкага фільма Э. Разанава "Гусарская балада", праведзена гульнёвая праграма "Повоюем вместе с героями".

Шаркаўшчынская раённая сетка публічных бібліятэк

У бібліятэках ЦБС працягваліся мерапрыемствы, прысвечаныя 130-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы. **5–6 ліпеня** ў Лужкаўскай сельскай бібліятэцы прайшлі валанцёрскія чытанні твораў Я. Купалы. **7 ліпеня** ў Вялікасельскай бібліятэцы адбылася гутарка-роздум "Таямніцаў поўнае жыццё" і віктарына ведаў па творчасці класіка "Нам засталася спадчына". **10 ліпеня** ў

будзе народ".

25 ліпеня ў ЦГБ імя М. Горкага адбылася творчая сустрэча бібліятэкараў ЦБС г. Віцебска з дэлегацыяй супрацоўнікаў ЦБС і прадстаўнікамі мясцовай улады г. Андрэапаля Цвярской вобласці Расіі.

28 ліпеня бібліятэка імя Я. Купалы брала ўдзел у Шагалаўскім свяце на вуліцы Пакроўскай. Непасрэдна ля бібліятэкі былі прадстаўлены разгорнутыя кніжныя выставы "Палёт над Віцебскам" (да 125-годдзя з дня нараджэння М. Шагала) і "Маіх радкоў няма без Беларусі" (да 130-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы).

Наваполацкая гарадская сетка публічных бібліятэк

Да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь у бібліятэцы імя К. Сіманава прайшла акцыя для чытачоў-ветэранаў. Ім былі прапанаваны кнігі і перыядычныя выданні з фонду камерцыйнага абанемента, якімі можна было карыстацца бясплатна 15 дзён.

Супрацоўнікі бібліятэкі імя У. Караткевіча апрабавалі новую форму работы – чытанне на вуліцах горада. **2 ліпеня** бібліятэкары ўслых чыталі вершы беларускіх пісьменнікаў-юбіляраў Я. Купалы, Я. Коласа і М. Танка.

Полацкая гарадская сетка публічных бібліятэк

4 ліпеня ў дзіцячай бібліятэцы-філіяле прайшоў ранішнік "Твая зямля, твая Радзіма названа светла – Беларусь" для дзяцей школьнага лагера СШ № 6, прысвечаны Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

30 ліпеня ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. М. Талстога адбылася пазнавальная вандроўка "З сябрамі па краіне «Перыёдыка»".

Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэк

Да Года кнігі ў ліпені бібліятэкамі ЦБС раёна былі праведзены наступныя мерапрыемствы: інтэлектуальная гульня па творчасці В. Віткі "Роднага слова ўсмешка" (Друйская сельская бібліятэка), літаратурна-музычная кампазіцыя "Цветы и порох" (Вайнюнская сельская

бібліятэка), прэзентацыя кнігі М. Чырскага “Купалавым шляхам” (Пагашчанская сельская бібліятэка).

З **4** па **10 ліпеня** ў цэнтральнай бібліятэцы прайшлі юбілейныя мерапрыемствы да 130-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы: выстава адной кнігі “Ты, Паўлінка мая, душа ласкавая”, гукавая кніжная выстаўка “Свайму народу песень дар”, літаратурна-музычны эцюд “Мелодыю мовы славянскай я чую”. Да ўдзелу ў мерапрыемствах былі запрошаны наведвальнікі тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага аблугоўвання насельніцтва, дзеці, падлеткі.

Дзень Янкі Купалы правялі **6 ліпеня** супрацоўнікі Друеўскай сельскай бібліятэкі для выхаванцаў Друеўскага дзіцячага дома. Была афармлена кніжная выстаўка “Янка Купала – пясняр Беларусі”, адбылася літаратурна-музычная кампазіцыя “І сняцца сны аб Беларусі”, праведзены конкурс чытальнікаў вершаў Я. Купалы.

Дзень паэта прайшоў **7 ліпеня** ў Відзаўскай сельскай бібліятэцы. У яго рамках адбыўся прагляд літаратуры “Шляхамі Я. Купалы” і гутарка-агляд “Вершы ў творчасці кампазітара Д. Смольскага”. Удзел у мерапрыемстве ўзялі супрацоўнікі і вучні музычнай школы.

8 ліпеня Плюская сельская бібліятэка запрасіла сваіх чытачоў на Дзень класікаў беларускай літаратуры. У праграме: кніжная выстава “Вяртанне да класікаў”, літаратурна-музычная кампазіцыя “Купала і Колас – наш гонар, сумленне і слава”.

Для падлеткаў з супрацьтуберкулёзнага рэабілітацыйнага цэнтра **29 ліпеня** ў дзіцячай бібліятэцы адбыўся патрыятычны ўрок “Хатынь: трагедыя і памяць”.

Верхнядзвінская раённая сетка публічных бібліятэк

***5* ліпеня** ў ЦРБ адбылася інфармацыйная гадзіна “І не змоўкнуць ніколі ў свеце Купалавы словы”, а **12 ліпеня** бібліятэкары цэнтральнай бібліятэкі сумесна з членамі клуба цікавых сустрэч “Сучаснік” правялі тэматычны вечар у гонар памяці святых Пятра і Феўронні.

29 ліпеня бібліятэкары Асвейскай бібліятэкі запрасілі на краязнаўчы вечар “Чтоб наш край озерный расцветал как

Гомельскай сельскай бібліятэцы **6 ліпеня** адбыўся літаратурна-музычны вечар “Назаўсёды застаўся ў народзе”, на які быў запрошаны старшыня літаратурнага аб’яднання “Наддзвінне”.

7 ліпеня Бабышчанская сельская бібліятэка-клуб правяла тэматычны вечар для старшакласнікаў сярэдняй школы, на якую запрасілі членаў літаратурнага аб’яднання “Крылы”.

14 ліпеня Бабыніцкая сельская бібліятэка і Лесаўская сельская бібліятэка-клуб прынялі ўдзел у падрыхтоўцы свята вёскі Ухвішча.

Сенненская раённая сетка публічных бібліятэк

У **ліпені** ў бібліятэках Сенненскай ЦБС прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя Году кнігі, 130-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы, Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

На базе Пламенскай сельскай бібліятэкі прайшоў выязны семінар “Спявай, звіні Купалаўская ліра” для бібліятэчных работнікаў раёна. Неафіцыйная частка праграмы семінара ўключала літаратурна-музычную кампазіцыю, падрыхтаваную загадчыцай мясцовай бібліятэкі *Валянцінай Хірэвіч* сумесна са школьным бібліятэкарам і загадчыкам клуба. Для бібліятэкараў была арганізавана экскурсія да маёнтка Свяцкага, якую правёў краязнавец з Сянно *Васіль Бандарэвіч*.

Супрацоўнікі бібліёбуса прымалі самы актыўны ўдзел у абслугоўванні працаўнікоў жатвы. Работнікі раённай бібліятэкі выязжалі з інфармацыйнымі паведамленнямі аб ходзе жніва ў рэспубліцы, вобласці і раёне, з аглядамі літаратуры, акцыямі да Году кнігі.

Талачынская раённая сетка публічных бібліятэк

У час канікул у Коханаўскай гарпасялковай бібліятэцы аб’яўлена акцыя “Вялікае летняе чытанне”. На дзіцячым абанеменце ўстаноўлена спецыяльная скрыня, у якую кожны жадаючы можа апусціць лісток з назвай прачытанай кнігі. Вынікі спаборніцтва будуць падведзены ў канцы жніўня.

“Пясняр зямлі беларускай” (Далгінаўская сельская бібліятэка-клуб), літаратурная гасцёўня “Магутнае слова, ты роднае слова…” (Язненскі СДК сумесна з бібліятэкай), літаратурная вечарына “Пясняр беларускай зямлі” (Завуццеўскі СК сумесна з бібліятэкай), літаратурна-музычны вечар “Пакуль ёсць Купала – будзе народ” (Цвецінскі СДК). Бібліятэкар Крукаўскай сельскай бібліятэкі для сваіх чытачоў падрыхтавала літаратурную вечарыну “Нам засталася спадчына”, на якой гучалі вершы Я. Купалы, гаварылі пра яго жыццё і творчасць.

Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама

Пастаўская раённая сетка публічных бібліятэк

У **ліпені** ў Парыжскай сельскай бібліятэцы прайшоў урок дзяржавазнаўства “Наш герб і сцяг – гэта сімвалы свабоды”.

10 ліпеня ў Пастаўскай раённай бібліятэцы ў рамках работы клуба па інтарэсах “Сучаснікі” быў праведзены музычна-паэтычны вечар, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння расійскага паэта *Льва Ашаніна* і да 80-годдзя з дня нараджэння расійскага паэта *Роберта Раждзественскага*.

26 ліпеня ў дзіцячай бібліятэцы імя У. Дубоўкі адбылася імпрэза-прэзентацыя фільма “Кветка шчасця Купалы”, прысвечаная 130-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы. Фільм зняты пастаўскім тэлебачаннем сумесна з супрацоўнікамі дзіцячай бібліятэкі. **27 ліпеня** выхаванцы аздараўленчага лагера “Алімпіец” былі запрошаны на літаратурную сустрэчу “Жыццё маё – ці васілёк, ці ружа”, прысвечаную дню нараджэння славутага земляка У. Дубоўкі.

Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк

3 ліпеня Мацюшэўская сельская бібліятэка запрасіла сваіх чытачоў на літаратурна-музычную кампазіцыю “Гэта быў час, які нельга забыць”, а супрацоўнікі Зялёнкаўскай сельскай бібліятэкі прапанавалі наведвальнікам прыняць удзел у тэматычным вечары “Памяць сэрца”.

Да 130-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы ў

май”.

Віцебская раённая сетка публічных бібліятэк

4 ліпеня ў Янавіцкай гарпасялковай бібліятэцы прайшоў літаратурна-паэтычны вечар “Беларусь у маім сэрцы”, прысвечаны Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Тэатральную гадзіну “Гісторыя аднаго спектакля”, прысвечаную п’есе Я. Купалы “Паўлінка”, прапанавала сваім чытачам Курынская сельская бібліятэка **7 ліпеня**.

7 ліпеня літаратурную імпрэзу “Свой скарб табе, народ, я аддаю” правялі супрацоўнікі цэнтральнай бібліятэкі і прысвяцілі яе 130-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы.

13 ліпеня выстава-прэзентацыя “У этой книги задержись, с хорошей книгой подружись” для чытачоў малодшага школьнага ўзросту прайшла ў Альгоўскай сельскай бібліятэцы.

20 ліпеня тэатралізаваную гадзіну перасцярогі “Опасные шалости Лисички-сестрички”, прысвечаную небяспечным паводзінам у лесе, падрыхтавала Тулаўская сельская бібліятэка для чытачоў малодшага школьнага ўзросту.

24 ліпеня ў цэнтральнай бібліятэцы адбыўся бенефіс, прысвечаны юбілею кіраўніка бібліятэчнай сеткі Віцебскай РЦБС *Галіны Дзмітрыеўны Нісневіч.*

Гарадоцкая раённая сетка публічных бібліятэк

У рамках фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску” на Гарадоцкім падворку супрацоўнікі цэнтральнай бібліятэкі аформілі кніжную выстаўку “Гарадок наш на вякі праславілі паэты-землякі”.

6 ліпеня ў Межанскай бібліятэцы, якая працуе як бібліятэка сямейнага чытання, адбыўся бенефіс аматараў чытання “Будет в семье лад, коли книге рад”.

25 ліпеня на базе Пальмінскай сельскай бібліятэкі прайшоў практыкум для сельскіх бібліятэкараў, прысвечаны пытанням прапаганды здаровага ладу жыцця. Увазе прысутных была прадстаўлена электронная прэзентацыя сельскай бібліятэкі і тэатралізаваны паказ “Новые

приключения зубных монстров”.

Докшыцкая раённая сетка публічных бібліятэк

Да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь цэнтральнай бібліятэкай быў падрыхтаваны бібліятэчны праект “Библиотека под открытым небом”. На гарадской плошчы жыхарам была прапанавана конкурсна-забаўляльная праграма, афармлена выстаўка кніг беларускіх выдавецтваў.

“Мир цветов таинственен и прекрасен” – літаратурны калейдаскоп пад такой назвай сабраў у чытальнай зале раённай бібліятэкі ўдзельнікаў двух клубаў – “Дакшычанка” (ЦБ) і “Кацюша” (цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва). Кветкаводы-аматары падзяліліся ведамі аб вырошчванні кветак на прысядзібных участках, далі парады пачынаючым кветкаводам.

У дзіцячай раённай бібліятэцы прайшоў урок беларусазнаўства “Не змоўкнуць ніколі ў свеце Купалавы словы…”. Падчас мерапрыемства адбылося віртуальнае падарожжа па музеі Я. Купалы ў Вязынцы.

У Бягомльскай гарпасялковай бібліятэцы адбылася размова на актуальную тэму “Мы поколение победителей” з выхаванцамі лагера адпачынку, прымеркаваная да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. На мерапрыемства запрасілі дырэктара завода “Ветразь” *Анатоля Віктаравіча Сіўко*, які 4 чэрвеня быў узнагароджаны медалём “За трудовые заслуги”.

Лепельская раённая сетка публічных бібліятэк

Шмат удзельнікаў і гасцей сабраў фестываль беларускай кнігі, які прайшоў у Бароўцы. У мясцовым цэнтры культуры і вольнага часу сабраліся бібліятэкары раёна, удзельнікі літаратурна-музычнага клуба “Выток” раённага Дома культуры, а таксама дзеці і падлеткі бароўскага летніку і рэспубліканскага рэабілітацыйна-аздараўленчага цэнтра “Жамчужына”. Гасцямі мерапрыемства сталі члены Саюза пісьменнікаў Беларусі *Т. Краснова-Гусачэнка* і *Б. Беляжэнка*. У праграму фестывалю ўвайшлі літаратурна-музычная кампазіцыя “Песняры «Зямлі пад белымі крыламі»”, акцыя

“Чытаем разам, чытаем па-беларуску!”. Маленькіх чытачоў чакалі “Вясёлы кнігавоз” з казкамі, вершамі і прыгодамі, віктарына “Беларуская казка – мудрая падказка”, конкурсна-гульнёвая праграма “Цікавая вандроўка па Кнігаградзе”. Адмыслова да свята былі наладжаны кніжныя выставы “Яе вялікасць Кніга”, “Вершаў любімыя радкі”, “Кніга з аўтографам”, якая распавяла пра сустрэчы ў бібліятэцы са знакамітымі пісьменнікамі, “Беларускія кнігі-юбіляры 2012 года” і інш. Падведзены вынікі акцыі “Чытацкая стужка”, падчас якой створана “цудоўнае дрэва”, да якога кожны ўдзельнік, які прачытаў беларускую кнігу, мог прымацаваць сваю галінку. Удзельнікі і госці фестывалю чыталі вершы, абменьваліся думкамі пра літаратурны працэс, выявілі сваё стаўленне да беларускай кнігі.

Лепельскі край. – 2012. – 13 ліп. – С. 5.

Міёрская раённая сетка публічных бібліятэк

У дзіцячай бібліятэцы прайшла сустрэча пакаленняў – дзяцей, дарослых і ветэранаў працы, якія на пачатак Вялікай Айчыннай вайны ячшэ былі непаўналетнімі, але прымалі ў ёй пасільны ўдзел.

Міёрскія навіны. – 2012. – 17 ліп. – С. 6.

Да свята горада ў **ліпені** супрацоўнікі Міёрскай раённай бібліятэкі падрыхтавалі кніжную выстаўку “Самая-самая”, прысвечаную Году кнігі. Самай чытаемай на сёняшні час была прызнана кніга Наталлі Батраковай “Міг бясконцасці”, самай старой – том твораў А. С. Серафімовіча, самай незразумелай – самавучыцель японскай мовы. Сярод самых патрэбных – даведнік абітурыента. Яшчэ чытачы вызначылі самую дарагую, самую тоўстую, спартыўную, турыстычную, духоўную кніжкі.

Творчасці класікаў беларускай літаратуры Я. Купалы і Я. Коласа ў бібліятэках Міёрскай ЦБС была прысвечана літаратурна-музычная кампазіцыя “На кожнай сцяжынцы іх песня і голас” (Мікалаёўская сельская бібліятэка) і літаратурная кампазіцыя “Волаты слова народнага” (Чэраская сельская бібліятэка). Да юбілею Я. Купалы ва ўстановах культуры праведзены мерапрыемствы: літаратурны партрэт